


# ФОРУМ БІБЛІЯТЭКАРАЎ






**23-25 мая прайшоў III Форум бібліятэкараў Беларусі «Гуманітарна-асветніцкая дзейнасць бібліятэк у кантэксце агульначалавечых каштоўнасцяў і беларускай дзяржаўнасці».**

Арганізатарамі ўжо традыцыйнага рэспубліканскага сходу бібліятэкараў розных сістэм і ведамстваў сталі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Беларуская бібліятэчная асацыяцыя», дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі» і Лагойскі раённы выканаўчы камітэт.

Урачыстае адкрыццё Форума і першае пленарнае паседжанне адбылося ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Падчас Форуму працавалі чатыры секцыі:
«Бібліятэкі ў сацыякультурным асяродку рэгіёнаў»,
«Інфармацыйныя тэхналогіі як фактар павышэння эфектыўнасці абслугоўвання карыстальнікаў»,
«Роля бібліятэкі ў станаўленні падрастаючай асобы»,
«Сацыяльнае і карпаратыўнае ўзаемадзеянне – умовы ўстойлівага развіцця бібліятэк».

На пленарных і секцыйных паседжаннях абмеркаваны праблемы нарматыўна-прававога забеспячэння дзейнасці бібліятэк, карпаратыўнага ўзаемадзеяння, укараненне ў практыку работы інфармацыйных тэхналогій, месца бібліятэкі ў сацыякультурным асяродку рэгіёнаў, статус бібліятэчнай прафесіі.

Адметнасцю III Форума было тое, што яго падтрымала і прафінансавала Міністэрства культуры і на пленарных паседжаннях былі заслуханы даклады аб дзейнасці бібліятэк вузаў, сетак тэхнічных, медыцынскіх і публічных бібліятэк Беларусі. Гэта дало магчымасць пазнаёміцца ўдзельнікам Форума з узроўнем матэрыяльнай базы і арганізацыі абслугоўвання ў бібліятэках усіх сістэм і ведамстваў рэспублікі.

Па выніках абмеркавання праблем на Форуме прынята рэзалюцыя, якая ўтрымлівае рашэнні па далейшаму развіццю бібліятэчнай справы ў краіне.

Матэрыялы Форума змешчаны на сайце Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі.




